| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 4.2. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу паўднёваславянскіх моў.<br>4.3. Гісторыя навукі пра паўднёваславянскія мовы. | | | | | | | |
| | **Славянскія мовы**<br>1. Агульная характарыстыка славянскіх моў.<br>2. ***Усходнеславянскія мовы і іх асаблівасці.***<br>2.1. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў усходніх славянаў.<br>2.2. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу ўсходнеславянскіх моў.<br>2.3. Гісторыя навукі пра ўсходнеславянскія мовы.<br>3. ***Заходнеславянскія мовы.***<br>3.1. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў заходніх славянаў.<br>3.2. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу заходнеславянскіх моў.<br>3.3. Гісторыя навукі пра заходнеславянскія мовы.<br>4. ***Паўднёваславянскія мовы.***<br>4.1. Аасноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў паўднёвых славянаў.<br>4.2. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу паўднёваславянскіх моў.<br>4.3. Гісторыя навукі пра паўднёваславянскія мовы. | | **2** | | | | | Тэрміналагічны дыктант |
| **6.** | **Славянскае пісьменства**<br>1. Гіпотэзы існавання пісьменства ў славянаў да | **1** | | | | | | |

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Кірылы і Мяфодзія.<br>2. Жыццё і дзейнасць асветнікаў Кірылы і Мяфодзія.<br>3. Паходжанне славянскіх азбук і пытанне аб іх першаснасці і аўтарстве.<br>4. Развіццё славянскіх графічных сістэм да нашага часу.<br>5. Славянскія помнікі пісьменства (надпісы, рукапісы, інкунабулы).<br>6. Захаванне і выданне старaславянскіх помнікаў пісьменства. | | | | | | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура

Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – 274 с.

Дуличенко, А.Д. Введение в славянскую филологию / А.Д. Дуличенко. – М.: Флинта, 2014. – 720 с.

### Дадатковая літаратура

Булахов М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – 225 с.

Минералов, Ю.М. Введение в славянскую филологию / Ю.М. Минералов. – М.: Высш. школа, 2009. – 331 с.

Рагаўцоў, В.І. Гісторыя мовазнаўства / В.І. Рагаўцоў. – Магілёў: МДУ, 2005. – 496 с.

Соколянский А.А. Введение в славянскую филологию / А.А. Соколянский. – М.: Изд. центр “Академия”, 2004. – 400 с.

Супрун А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Мн.:Выш. школа, 1989. – 480 с.

Трубачёв О.Н. Этногенез и культура древнейших славян: лингвистические исследования / О.Н. Трубачёв. – М.:Наука, 2003. – 495 с.

Цыхун, Г.А. Выбраныя працы: беларусістыка, славістыка, арэальная лінгвістыка / Г.А. Цыхун. – Мінск: РИВШ, 2012. – С. 67 – 82.

Шушарина, И.А. Введение в славянскую филологию / И.А. Шушарина. – М.: Флинта; Наука, 2011. – 302 с.

Щеглова, О.Г. Введение в славянскую филологию / О.Г. Щеглова. – Новосибирск: НовосибГУ. 2013. – 126 с.

Языки мира: Славянские языки. – М.: Academia, 2005. – 656 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА**

| **Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне** | **Назва кафедры** | **Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне** | **Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму** |
|---|---|---|---|
| Беларускае мовазнаўства | беларускага мовазнаўства | няма | Пратакол № 6 ад 17.03.2015 г. |
| Гісторыя беларускай мовы | беларускага мовазнаўства | няма | Пратакол № 6 ад 17.03.2015 г. Пратакол № 6 ад 17.03.2015 г. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Пералік тэарэтычных пытанняў да заліку па дысцыпліне “Уводзіны ў славянскую філалогію”**

1. Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі, яе сувязь з іншымі гуманітарнымі навукамі.
2. Славяне і славянскія мовы.
3. Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад.
4. Праславянская мова, час яе існавання і перыядызацыя.
5. Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы.
6. Першыя звесткі пра славянаў. Паходжанне этноніма. Міжэтнічныя і міжмоўныя кантакты ў праславянскі перыяд.
7. Час і месца фарміравання славянаў. Арэал пражывання славянаў.
8. Лінгвістычны аспект праблематыкі славянскай прарадзімы. Сучасныя тэорыі славянскай прарадзімы.
9. Агульная характарыстыка славянскіх моў.
10. Гісторыя стварэння славянскай пісьменства.
11. Канстанцін (Кірыл) і Мяфодзій і славянскае пісьменства.
12. Паходжанне глаголіцы і кірыліцы. Параўнальны аналіз азбук.
13. Славянскія помнікі пісьменнасці: надпісы.
14. Славянскія помнікі пісьменнасці: рукапісы.
15. Славянскія помнікі пісьменнасці: інкунабулы.
16. Помнікі стараславянскай мовы.
17. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: беларуская мова.
18. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: руская мова.
19. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: украінская мова.
20. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: польская мова.
21. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: сербалужыцкія мовы.
22. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: чэшская мова.
23. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: славацкая мова.
24. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: балгарская мова.
25. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: македонская мова.
26. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: сербская мова.
27. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: харвацкая мова.
28. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: славенская мова.
29. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка ў XIX стагоддзі.
30. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка канца XIX – пачатку XX стагоддзя.
31. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка ў XX стагоддзі.
32. Славістыка на сучасным этапе. Актуальныя задачы славістыкі.
33.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# 3. Практычны раздзел

## Тэма 1. 1. Уводзіны.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

1.1. Паняцце пра славянскую філалогію і яе структуру.
1.2. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі.
1.3. Прадмет і задачы славянскай філалогіі.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 5 – 20.
2. Дуличенко, А.Д. Введение в славянскую филологию / А.Д. Дуличенко. – М.: Флинта, 2014. – С. .
3. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 3 – 13.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 2. Славянскія народы.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

. Геаграфічна-гістарычная характарыстыка славянскіх народаў.
. Сучасны стан славянскіх дзяржаў і народаў.
. Канфесійная прыналежнасць славянаў.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 21 – 77.
2. Дуличенко, А.Д. Введение в славянскую филологию / А.Д. Дуличенко. – М.: Флинта, 2014. – С. .
3. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 3 – 13.

## Тэма 3. Праіндаеўрапейская мова.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

Індаеўрапейская моўная сям’я.
Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад.
Тэорыя аб настратычных мовах.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 78 – 102.
2. Дуличенко, А.Д. Введение в славянскую филологию / А.Д. Дуличенко. – М.: Флинта, 2014. – С. .
4. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 3 – 13.

## Тэма 4. Праславянская мова.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

4.1. Праславянская мова як адна з індаеўрапейскіх моў, час яе існавання і перыядызацыя.
4.2. Праіндаеўрапейская фанетычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове.
4.3. Праіндаеўрапейская граматычная спадчына і яе трансфармацыя ў праславянскай мове.
4.4. Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 103 – 128.
2. Дуличенко, А.Д. Введение в славянскую филологию / А.Д. Дуличенко. – М.: Флинта, 2014. – С.
3. Супрун, А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Минск: Выш. шк., 1989. – С. 16 – 25.
4. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхожденіе, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 88 – 94.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 5-1. Славянскія мовы.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

5-1.1. Агульная характарыстыка славянскіх моў.
5-1.2. *Усходнеславянскія мовы і іх асаблівасці*.
5-1.3. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў усходніх славянаў.
5-1.4. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу ўсходнеславянскіх моў.
5-1.5. Гісторыя навукі пра ўсходнеславянскія мовы.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***


1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 129 – 161.
2. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 14 – 33; 122 –146; 198 – 212.
3. Супрун, А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Минск: Выш. шк. , 1989. – С. 30 – 64.
4. Цыхун, Г.А. Выбраныя працы: беларусістыка, славістыка, арэальная лінгвістыка / Г.А. Цыхун. – Мінск: РІВШ, 2012. – С. 67 – 82.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Тэма 5-2. Славянскія мовы.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

5-2.1. *Заходнеславянскія мовы*.
5-2.2. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў заходніх славянаў.
5-2.3. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу заходнеславянскіх моў.
5-2.4. Гісторыя навукі пра заходнеславянскія мовы:

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***


1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 162 – 190.

2. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхождение, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 74 – 87; 147 – 155; 164 – 172; 213 – 223.
3. Супрун, А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Минск: Выш. шк., 1989. – С. 64 – 99.

## Тэма 5-3. Славянскія мовы.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

1. *Паўднёваславянскія мовы*.
2. Асноўныя звесткі аб узнікненні і развіцці пісьменнасці і гісторыі літаратурных моў паўднёвых славянаў.
3. Асаблівасці графікі, фанетыкі, лексічнага і граматычнага складу паўднёваславянскіх моў.
4. Гісторыя навукі пра паўднёваславянскія мовы.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

5-3.1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. – Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 191 – 251.
5-3.2. Булахов, М.Г. Славянские языки: происхожденіе, история, современное состояние / М.Г. Булахов. – Минск: БГПУ, 2001. – С. 34 – 46; 66 – 74; 156 – 164; 172 – 184.
5-3.3. Супрун, А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Минск: Выш. шк., 1989. – С. 99 – 129.
5-3.4. Цыхун, Г.А. Выбраныя працы: беларусістыка, славістыка, арэальная лінгвістыка / Г.А. Цыхун. – Мінск: РІВШ, 2012. – С. 67 – 82.

## Тэма 6. Славянскае пісьменства.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

6.1. Гіпотэзы існавання пісьменства ў славянаў да Кірылы і Мяфодзія.
6.2. Жыццё і дзейнасць асветнікаў Кірылы і Мяфодзія.
6.3. Паходжанне славянскіх азбук і пытанне аб іх першаснасці і аўтарстве.
6.4. Развіццё славянскіх графічных сістэм да нашага часу.
6.5. Славянскія помнікі пісьменства (надпісы, рукапісы, інкунабулы).
6.6. Захаванне і выданне стараславянскіх помнікаў пісьменства.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

1. Багдзевіч, А.І. Уводзіны ў славянскую філалогію / А.І. Багдзевіч, С.Г. Ляскевіч. Гродна: ГрДУ, 2011. – С. 252 – 272.
2. Супрун, А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Минск: Выш. шк., 1989. – С. 265 – 314.

## Тэма 7. З гісторыі славянскай філалогіі. Славістыка на сучасным этапе.

***Асноўныя пытанні тэмы:***

7.1. Заснавальнікі славістыкі: *І. Добраўскі, Е. Капітар, А.Х. Вастокаў, П.Й. Шафарык*.

7.2. Поспехі славістыкі ў XIX стагоддзі: *А.А. Патабня, А. Шлейхер, Ф. Міклашыч, А. Лескін, І.В. Ягіч, І.А. Бадуэн дэ Куртэнэ, Ф.Ф. Фартунатаў*.

7.3. Славістыка і славісты ў XX стагоддзі: *Р.Ф. Брандт, А.І. Сабалеўскі, Я.Ф. Карскі, А.А. Шахматаў, М.Н. Спяранскі, І.Я. Франко, І.С. Свянціцкі, Я.М. Развадоўскі, Л. Нідэрле, А.І. Беліч, М.М. Петэрсан, Л.У. Шчэрба, А.М. Сялішчаў, Л.А. Булахоўскі, П.А. Бузук, Б. Гаўранек, Р.В. Якабсон, М.С. Трубяцкі, Ц.П. Ломцеў, В.У. Іваноў.*

7.4. Славістыка на сучасным этапе. Актуальныя задачы сучаснай славістыкі.

***Тэарэтычны матэрыял па тэме заняткаў гл. у наступных дапаможніках:***

1. Рагаўцоў, В.І. Гісторыя мовазнаўства / В.І. Рагаўцоў. – Магілёў: МДУ, 2005. – С. 89 – 99; 122 – 132.
2. Супрун, А.Е. Введение в славянскую филологию / А.Е. Супрун. – Минск: Выш. шк., 1989. – С. 315 – 433.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 3.2. Тэматыка рэфератаў

1. Характарыстыка славянскіх народаў паводле канфесійнай прыкметы.
2. Прарадзіма індаеўрапейцаў і распад праіндаеўрапейскай мовы.
3. Праславянская мова як адна з індаеўрапейскіх моў.
4. З гісторыі фарміравання старажытнарускай мовы.
5. Прапаведніцкая і асветніцкая дзейнасць Кірылы і Мяфодзія.
6. Пытанне першаснасці і аўтарства славянскіх азбук.
7. Развіццё славянскіх графічных сістэм да нашага часу.
8. Мовазнаўства ва ўсходнеславянскіх народаў.
9. Развіццё ведаў пра мову ў паўднёвых славянаў.
10. Развіццё ведаў пра мову ў заходніх славянаў.
11. Франц Міклашыч як заснавальнік славянскага параўнальна-гістарычнага мовазнаўства.
12. Славістычная дзейнасць І.Добраўскага.
13. Актуальныя задачы сучаснай славістыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 4.1. Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі.

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб ўзроўні паспяховасці студэнтаў мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю ўжываецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

**Дыягностыка кампетэнцый** па дысцыпліне можа мець розныя формы.

Вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, вусны аналіз тэксту старaславянскага пісьменства, вусны залік.

## 4.2. Крытэрыі ацэнкі вынікаў навучання

1. Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнта на заліку па дысцыпліне ”Уводзіны ў славянскую філалогію” ажыццяўляецца па двухбальнай шкале (залічана, незалічана).

2. Залік праводзіцца ў вуснай або пісьмовай форме. Форма правядзення заліку вызначаецца выкладчыкам і зацвярджаецца ва ўстаноўленым парадку на пасяджэнні кафедры.

3. Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў прымяняюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

## 4.3. Праграма заліку

1. Прадмет і задачы славянскай філалогіі. Крыніцы звестак па славянскай філалогіі, яе сувязь з іншымі гуманітарнымі навукамі.
2. Славяне і славянскія мовы.
3. Час і месца існавання праіндаеўрапейскай мовы, яе распад.
4. Праславянская мова, час яе існавання і перыядызацыя.
5. Развіццё лексічнага фонду праславянскай мовы.
6. Першыя звесткі пра славянаў. Паходжанне этноніма. Міжэтнічныя і міжмоўныя кантакты ў праславянскі перыяд.
7. Час і месца фарміравання славянаў. Арэал пражывання славянаў.
8. Лінгвістычны аспект праблематыкі славянскай прарадзімы. Сучасныя тэорыі славянскай прарадзімы.
9. Агульная характарыстыка славянскіх моў.
10. Гісторыя стварэння славянскага пісьменства.
11. Канстанцін (Кірыл) і Мяфодзій і славянскае пісьменства.
12. Паходжанне глаголіцы і кірыліцы. Параўнальны аналіз азбук.
13. Славянскія помнікі пісьменнасці: надпісы.
14. Славянскія помнікі пісьменнасці: рукапісы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

15. Славянскія помнікі пісьменнасці: інкунабулы.
16. Помнікі старaславянскай мовы.
17. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: беларуская мова.
18. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: руская мова.
19. Асаблівасці ўсходнеславянскіх моў: украінская мова.
20. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: польская мова.
21. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: сербалужыцкія мовы.
22. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: чэшская мова.
23. Асаблівасці заходнеславянскіх моў: славацкая мова.
24. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: балгарская мова.
25. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: македонская мова.
26. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: сербская мова.
27. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: харвацкая мова.
28. Асаблівасці паўднёваславянскіх моў: славенская мова.
29. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка ў XIX стагоддзі.
30. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка канца XIX – пачатку XX стагоддзя.
31. З гісторыі славянскай філалогіі: славістыка ў XX стагоддзі.
32. Славістыка на сучасным этапе. Актуальныя задачы славістыкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 5.1. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў.

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

**Крыніцай інфармацыі** пры выкананні студэнтамі названых відаў самастойнай работы могуць выступаць: канспект, друкаваныя матэрыялы, падручнікі і слоўнікі, матэрыялы на электронных носьбітах.

**Самастойная праца** студэнтаў **прадугледжвае**:

– вывучэнне лекцыйнага матэрыялу, працу з навуковай літаратурай пры вывучэнні раздзелаў лекцыйнага курсу, вынесеных на самастойнае авалоданне;

– падрыхтоўку да практычных заняткаў;

– выкананне індывідуальных заданняў, прадугледжаных вучэбным планам.

Асноўныя **віды заданняў** для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плану тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– выпіскі з тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі; азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для **замацавання і сістэматызацыі ведаў**, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на занятках;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.

Для **фарміравання ўменняў** выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– стварэнне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыё- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на саматойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных **відаў самастойнай работы** рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю).

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосаба з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю).

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю).

Для правядзення **кантролю** самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– практычныя заняткі;

– залікі па тэмах, па раздзелах.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляць карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойных прац, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г.д.

**Крытэрыямі адзнакі вынікаў** самастойнай працы студэнта могуць з'яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 5.2. Рэкамендацыі па правядзенні навуковых даследаванняў.

Навуковыя даследаванні ў галіне славянскай філалогіі на сённяшні дзень з’яўляюцца выключна актуальнымі і папулярнымі ў айчыннай навуцы. Найперш важна вывучэнне лексічнай, граматычнай і фанетычнай сістэм сучасных славянскіх моў, а таксама лінгвагеаграфічныя працы. Асноўныя метадычныя рэкамендацыі па правядзенні самастойных навуковых даследаванняў у галіне славістыкі наступныя:

***1. Падрыхтоўчы этап.***

*1.1. Вызначэнне аб’екта даследавання.* Спачатку выбіраецца аб’ект і прадмет даследавання. Для паспяховай працы ў абраным накірунку неабходна ўважліва пазнаёміцца з навуковай літаратурай па прадмеце даследавання. Прачытаную літаратуру неабходна фіксаваць у спецыяльным сшытку, у якім таксама робяцца асобныя выпіскі, або нават і падрабязныя каспекты з указаннем канкрэтных старонак. У працэсе азнаямлення з літаратурай па абранай навуковай праблеме важна вылучаць зыходныя палажэнні, ход разважанняў, сістэму доказаў навукоўца, асэнсоўваць прынцыпы класіфікацыі моўнага матэрыялу, лагічнасць вывадаў. Важна засвоіць (выпісаць) неабходную лінгвістычную тэрміналогію па разглядаемай праблематыцы, бо без ведання тэрміналогіі могуць узнікнуць цяжкасці інтэрпрэтацыі ўласнаручна сабранага матэрыялу.

*1.2. Складанне бібліяграфіі па праблеме даследавання.* Асноўную лінгвістычную літаратуру прапануе навуковы кіраўнік. Пры складанні спіса літаратуры неабходна выкарыстоўваць разнастайныя бібліяграфічныя выданні. Пажадана, каб спіс літаратуры ўдакладняўся праз сістэматычны і алфавітны каталогі бібліятэк.

*1.3. Збор і сістэматызацыя фактычнага матэрыялу.* Фактычны матэрыял падбіраецца ў адпавенасці з мэтай, задачамі і аб’ектам даследавання з розных крыніц: слоўнікаў славянскіх моў, у тым ліку і дыялектных, лінгвістычных атласаў, літаратурных, фальклорных і дыялектных тэкстаў. У выніку ствараецца асобная картатэка фактычнага матэрыялу, на падставе якой будзе праводзіцца асноўнае навуковае даследаванне. Запіс фактычнага матэрыялу традыцыйна ажыццяўляецца на картках. Па заканчэнні збору праводзіцца сістэматызацыя і класіфікацыя сабранага матэрыялу ў адпаведнасці з мэтай і задачамі даследавання.

***2. Правядзенне даследчай працы.***

*2.1. Складанне плана даследавання.* Неабходна старанна прадумаць і скласці разгорнуты план працы, які раскрывае яе змест і сутнасць. Дэталёвы, прадуманы план, як правіла, адлюстроўвае сістэму і паслядоўнасць у выкладзе фактычнага матэрыялу, канкрэтызуе асобныя напрамкі даследавання. Фармулёўка назваў структурных частак даследавання з’яўляецца сэнсавым ядром вывучаемай з’явы. Назва кожнай такой часткі ў плане дэманструе яе лагічную завершанасць і суаднесенасць са зместам усяго даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*2.2. Кампазіцыйная пабудова працы.* Любая навуковая праца, незалежна ад характару даследаванага матэрыялу, змяшчае тры арганічна звязаныя структурныя элементы: уводзіны, асноўную частку і заключэнне, а таксама спіс выкарыстанай літаратуры. Дапускаецца наяўнасць розных дадаткаў, калі гэтага патрабуе логіка раскрыцця тэмы даследавання.

*2.2.1. Уводзіны.* Гэтая частка ўключае наступныя элементы: увядзенне ў праблематыку, г.зн. навуковая праблема і месца ў ёй вырашаемых задач. Ва ўводзінах могуць быць таксама апісаны асноўныя фанетычныя і граматычныя асаблівасці канкрэтнай славянскай мовы (моў) ці дыялекту. Абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы даследавання, фармулюецца мэта і задачы працы, прадмет і аб'ект даследавання. ***Мэта*** навуковага даследавання фармулюецца лаканічна і дакладна, прыкладна так: даследаваць (вывучыць) заканамернасці (асаблівасці ўжывання)…; выявіць і апісаць факты выкарыстання…;__і г.д. ***Задач даследавання*** можа быць 3-4 (у адпаведнасці са структурай і зместам працы). Напрыклад, правесці класіфікацыю і выявіць …; акрэсліць спецыфіку выкарыстання..; вызначыць частотнасць ужывання..; разгледзець структурныя тыпы… ***Аб'ектам даследавання*** з'яўляецца пэўная славянская мова (мовы). ***Прадмет даследавання*** – гэта канкрэтны накірунак, які вылучаецца з аб'екта. Напрыклад, у канкрэтнай славянскай мове можна вывучаць розныя лексічныя найменні (назвы гаспадарчых вырабаў, назвы страў, назвы лекавых раслін, адзення і абутку і г.д.), асаблівасці ўжывання пэўнай групы лексем, фанетычных або граматычных асаблівасцей і інш. Аб'ём уводзін павінен складаць 3-5 старонак друкаванага тэксту.

*2.2.2.* ***Асноўная частка*** змяшчае класіфікацыю матэрыялу ў адпаведнасці з задачамі даследавання, апісанне і аналіз яго. Асноўная частка складаецца з раздзелаў, падраздзелаў і параграфаў, пунктаў. Аптымальная колькасць раздзелаў у асноўнай часткі гэта 2, можа быць 3, але не больш. Падзел работы на раздзелы і падраздзелы павінен адпавядаць логіцы класіфікацыі і выкладу матэрыялу. Кожны падраздзел, як правіла, заканчваецца падагульненнем, невялікім вывадам. У канцы раздзела фармулюецца агульны вывад. У асноўнай частцы могуць быць тэарэтычны і практычны раздзелы, але неабавязкова. Тэарэтычны матэрыял па тэме даследавання сцісла можна змясціць і ва ўводзінах, калі фактычны практычны матэрыял надта аб'ёмны.

***Тэарэтычная частка*** як асобны раздзел асноўнай часткі навуковай работы змяшчае: агляд літаратуры па тэме даследавання, распрацаваныя і апісаныя ў навуковай літаратуры класіфікацыі, метады вырашэння дадзенай задачы, асноўныя тэарэтычныя палажэнні. Пры аглядзе літаратуры пажадана выкарыстоўваць як мінімум 7-10 навуковых крыніц. Практычная частка будуецца на падставе аналізу фактычнага матэрыялу. Усе разважанні, факты павінны мець дастаткова пераканальныя падставы, не разыходзіцца з фактычным матэрыялам. У гэтай частцы могуць быць змешчаны табліцы, графікі, дыяграмы і г.д. Асабліва каштоўна, калі аўтар падае свае каментарыі, прапановы, рэкамендацыі, якія з'яўляюцца вынікам вывучэння і абагульнення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Аб’ём асноўнай часткі складае прыкладна 15 – 20 старонак. Пажадана, каб раздзелы прапарцыянальна суадносіліся па аб’ёме. У асноўнай частцы могуць быць прадстаўлены: фанетычны, семантычны, словаўтваральны, этымалагічны аналіз аналіз сабранага фактычнага матэрыялу.

*2.2.3. Заключэнне* адлюстроўвае вынікі праведзенай навуковай работы, змяшчае вывады па ўсіх раздзелах працы. Аб’ём 1 – 2 старонкі.

*2.2.4. Спіс літаратуры* дае ўяўленне пра выкарыстаную навуковую літаратуру пры напісанні навуковай работы. Колькасць тэарэтычных крыніц для студэнцкай навуковай працы павінна быць не менш за 15 найменняў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ